*М.Л.КУЗЬМІНІЧ*

# МУЗЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ ВА ЎМОВАХ САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНАЙ ТРАНСФАРМАЦЫІ ГРАМАДСТВА (Мінск, першая чвэрць ХХ ст.)

Музычная адукацыя ўваходзіць у разгалінаваную сістэму сацыякультур-ных інстытутаў грамадства, выступаючы адначасова як цэласная з’ява і як кампанент музычнай культуры грамадства. У структуры адукацыі вылучаюцца дзве падсістэмы – агульная і прафесійная музычная адукацыя. Агульная музычная адукацыя прадвызначае далучэнне да музычнага мастацтва ўсіх слаёў насельніцтва праз вывучэнне імі музычных дысцыплін у агульнаадукацыйных установах, праз сямейнае выхаванне і самавыхаванне, уключэнне ў разнастайныя формы музычна-асветніцкай дзейнасці, праз актыўную аматарскую творчасць і музычную самадзейнасць. Прафесійная музычная адукацыя разглядаецца намі як сістэма падрыхтоўкі музыкантаў, якую складаюць створаныя ў грамадстве адпаведныя сацыяльныя інстытуты па музычным навучанні будучых прафесійных музыкантаў, як працэс перадачы сукупнасці музычных ведаў, уменняў і навыкаў, мастацкіх метадаў і творчых прынцыпаў, вопыту светаўспрымання сродкамі музычнага мастацтва.

Пры ўсёй кансерватыўнасці адукацыйнай сістэмы музычная адукацыя пастаянна адчувае ўплыў сацыяльных працэсаў, якія адбываюцца ў грамадстве, і рэагуе на гэтыя працэсы зменамі ў сваёй структуры, з’яўленнем новых навучальных устаноў, прынцыпаў, формаў і метадаў музычнага навучання. Паказальным у гэтым сэнсе з’яўляецца вопыт развіцця музычнай адукацыі ў першай чвэрці ХХ ст. на фоне рэвалюцый 1905–1907, 1917 гг., першай сусветнай і грамадзянскай войн, усталявання савецкай улады ў беларускай сталіцы.

Музычна-асветніцкая дзейнасць творчай інтэлігенцыі Мінска ў пачатку ХХ ст. сярод маламаёмных слаёў насельніцтва была адметнай з’явай культурнага жыцця. Ствараліся аматарскія аркестры і харавыя калектывы, распаўсюджвалася сямейнае музіцыраванне, звычайнай практыкай стала правядзенне аматарскіх музычных вечароў. Шырылася гастрольна-канцэртная дзейнасць прыезджых музыкантаў, расла актыўнасць мясцовых салістаў і творчых калектываў. Цэнтрамі распаўсюджання ідэй усеагульнай музычнай адукацыі і масавага музычна-эстэтычнага выхавання былі музычныя таварыствы і гурткі. Усё гэта стымулявала рост цікавасці ў беларускім грамадстве да заняткаў музыкай, набыцця музычных ведаў, навыкаў спеваў і ігры на музычных інструментах.

У мэтах распаўсюджання ідэй усеагульнай адукацыі і масавага музычна-эстэтычнага выхавання народа перадавыя дзеячы музычнага мастацтва аб’ядноўваліся ў таварыствы. У 1898 г. творчую інтэлігенцыю горада аб’яднала Мінскае таварыства аматараў прыгожых мастацтваў. Пры яго музычнай секцыі дзейнічаў аркестр пад кіраўніцтвам корпуснага ўрача Касухіна, а затым адваката В.Чавусава. Секцыя арганізоўвала суботнія танцавальныя вечары з музычным і літаратурным аддзяленнямі, а з 1903 г. праводзіла агульнадаступныя канцэрты. У музычна-асветніцкай дзейнасці таварыства прымалі ўдзел прафесійныя музыканты, педагогі музычнай школы С.Шацкінай. Яны давалі кансультацыі па падрыхтоўцы да выступленняў у канцэртах таварыства, музіцыравалі разам з аматарамі. Таварыства аб’ядноўвала перадавую, радыкальна настроеную інтэлігенцыю Мінска. Таму пад уплывам сацыяльна-грамадскіх падзей 1905–1907 гг. яго дзейнасць набыла рэвалюцыйную афарбоўку, і ў 1906 г. яно было закрыта.

Але інтэлігенцыя аб’ядналася ў Літаратурна-артыстычнае таварыства з музычным, драматычным і мастацкім аддзяленнямі. Добрыя зборы ад канцэртаў новага аб’яднання забяспечвалі ўдзел у рабоце яго калектываў папулярных прафесійных музыкантаў. Сярод іх скрыпач Н.Рубінштэйн, які пасля заканчэння Пецярбургскай кансерваторыі вярнуўся ў родны Мінск і ўзначаліў струнны квартэт з удзелам Я.Чыжэўскага, Е.Бародкіна, М.Пестрыкава. У 1908 г. мандалінна-балалаечна-гітарны аркестр таварыства арганізаваў Б.Навіцкі ра- зам з С.Фальскім. У 1909 г. з-за фінансавых цяжкасцей Літаратурна-артыстычнае таварыства было ліквідавана. Яго мастацкія калектывы ўвайшлі ў склад польскага і яўрэйскага таварystваў, купецкага і іншых клубаў горада.

У 1910–1914 гг. царскі чыноўнік, старшыня Рускага грамадскага сходу, вялікі аматар музыкі, дырыжор, адукаваны музыкант Н.Лялюхін зрабіў спробу адрадзіць Таварыства прыгожых мастацтваў у Мінску. Ён імкнуўся аднавіць дзейнасць музычнага і драматычнага гурткоў, арганізаваць разам з Б.Навіцкім аркестр рускіх народных інструментаў і хор. Лялюхін праводзіў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канцэрты з удзелам розных калектываў Мінска. Аднак дастойную яму канкурэнцыю стваралі калектывы Мінскага музычнага вучылішча Н.Рубінштэйна, якое з 1907 г. па 1914 г. было несумненным лідэрам не толькі ў пытаннях музычнай адукацыі, але і шырокай музычна-асветніцкай дзейнасці.

Значную ролю ў музычным жыцці Мінска адыграла Таварыства сяброў музыкі (1912–1917), дзейнасць якога была скіравана на аб'яднанне прафесіяналаў і музыкантаў-аматараў, развіццё музычнага мастацтва і аказанне дапамогі жыхарам горада ў атрыманні музычнай адукацыі. У гэтых мэтах праводзіліся музычныя вечары, канцэрты, чытанні, уводзіліся стыпендыі для малазабяспечаных, але таленавітых мінчан, якія навучаліся ў сталічных кансерваторыях. У 1913 г. былі адкрыты чытальня і бібліятэка, ішла падрыхтоўка да адкрыцця народных музычных класаў. У рабоце таварыства актыўны ўдзел прымалі выкладчыкі і навучэнцы музычнага вучылішча Н.Рубінштэйна, з удзелам якіх праводзіліся агульнадаступныя сімфанічныя канцэрты ў рабочых кварталах Мінска.

У 1913 г. мінскія музыканты Ю.Марковіч і Г.Львова выступілі з ініцыятывай адкрыцця ў Мінску аддзялення Рускага музычнага таварыства. Але пачалася першая сусветная вайна, і гэта ідэя не была рэалізавана.

Музычнае выхаванне ў агульнаадукацыйных установах да пачатку XX ст. набыло сістэматычны характар. Урокі музыкі значыліся сярод вучэбных прадметаў пансіёнаў, гімназій, спецыялізаваных і іншых навучальных устаноў для дзяцей з забяспечаных сем'яў. Узрастаючы інтарэс гарадскога насельніцтва да набыцця музычна-практычных навыкаў задавальняўся і праз сетку надомных і гарадскіх прыватных музычных школ. У настаўніцкіх семінарыях, на шматлікіх музычных курсах ішла мэтанакіраваная падрыхтоўка выкладчыкаў спеваў для народных школ, у якіх урокі музыкі ў пачатку XX ст. былі ўведзены ў якасці абавязковага прадмета. Выкладчык павінен быў ведаць нотную грамату, песнапенні праваслаўнага богаслужэння, умець спяваць харавыя партыі ("на галасы"), карыстацца камертонам і партытурай, стварыць дзіцячы хор і кіраваць ім.

У агульнаадукацыйных установах Мінска спевы выкладалі лепшыя рэгенты горада: у мужчынскай гімназіі – Ф.Леўчанка, у жаночай гімназіі – М.Леўчанка, у духоўнай семінарыі – Былінскі, у Першым гарадскім вучылішчы – І.Краснапеўцаў, у чыгуначнай школе – В.Чарнякоўскі, у камерцыйным вучылішчы – А.Стасія, у рэальным вучылішчы – Г.Кільчэўскі, у жаночым царкоўным вучылішчы – В.Кашын, у Духавым манастыры – П.Саладуха, у прыходскім 3-класным вучылішчы – А.Сцепуржынскі, у гарадскім 4-класным вучылішчы – Ф.Семяненка, у дзіцячым прытулку для дзяўчынак – У.Тэраўскі. Сярод выкладчыкаў музыкі прыватных гімназій таксама значыліся аўтарытэтныя ў Беларусі музыканты.

У мэтах забеспячэння навучальных устаноў для народа выкладчыкамі спеваў у Мінску ў пачатку XX ст. працавалі музычныя курсы. Тут будучыя народныя настаўнікі засвойвалі "нотную азбуку, састаў гамы, мажор, мінор", лічбавую методыку навучання спевам ("спосаб Шэве") і інш. Так, у маі 1902 г. па прапанове М.Пестрыкава Мінскі губернскі камітэт Апякунства народной цвярозасці адкрыў у Мінску курсы харавых спеваў. Пестрыкаў не толькі распрацаваў праграму курсаў, але і забяспечыў яе выкананне. Курсы паклалі пачатак рэгулярна праводзімым заняткам з арганізатарамі харавых спеваў у сельскай мясцовасці.

У чэрвені 1903 г. пры Мінскім рэальным вучылішчы працавалі курсы царкоўных і свецкіх спеваў для настаўнікаў Мінскай губерні, дзе яны атрымлівалі навыкі кіравання харамі ў сельскай мясцовасці. На курсах вучыліся 38 чалавек на працягу 45 дзён. Арганізатарам і кіраўніком курсаў быў М.Пестрыкаў. Працавалі таксама музычныя курсы Я.Клімава, Л.Бохан, Г.Цухтмана. Выкладаліся ігра на фартэпіяна, тэорыя музыкі, сальфеджыо, харавыя спевы.

У 1912 г. на сродкі Мінскага земства былі адкрыты кароткатэрміновыя курсы для настаўнікаў пачатковых вучылішчаў павета. Імі кіравалі В.Кашын (царкоўныя спевы) і рэгент В.Чарнякоўскі (свецкія спевы). У канцы навучання хор слухачоў выступіў са справаздачнымі канцэртамі.

У 1914 г. у Мінску зноў працавалі часовыя педагагічныя курсы пад кіраўніцтвам В.Чарнякоўскага. Слухачы атрымлівалі кваліфікаваную метадычную дапамогу ў пытаннях фарміравання вакальна-харавых навыкаў, арганізацыі і кіравання харавымі калектывамі. Справаздачныя канцэрты хору слухачоў адбыліся ў Мінску, Барысаве, Мар'інай Горцы і іншых гарадах.

З 1914 г. піяністка Г.Львова адкрыла музычныя курсы з педагагічным ухілам пры Аляксееўскай жаночай гімназіі ў Мінску. На працягу трох гадоў навучання курсісткі займаліся ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

класах фартэпіяна, скрыпкі, сольных і харавых спеваў, ансамбля, а таксама вывучалі тэорыю і гісторыю музыкі, эстэтыку, методыку фартэпіяннай ігры, гісторыю мастацтваў, сальфеджыо і гармонію. Тыя, хто паспяхова прайшоў курс навучання, атрымлівалі кваліфікацыю выкладчыка музычнай школы.

У сувязі з эвакуацыяй насельніцтва Мінска ў 1915 г. Г.Львова перабудавала праграму курсаў і абмежавалася ў асноўным выхаваннем дзяцей. Пры курсах быў адкрыты дзіцячы сад, які наведвалі дзеці пачынаючы з 4-гадовага ўзросту. Тут вялася эксперыментальная работа, праводзіліся адкрытыя паказы дзіцячых ”музычных практыкаванняў”. З лістапада 1916 г. пачаўся прыём навучэнцаў у класы фартэпіяна, скрыпкі, спеваў. Быў атрыманы дазвол таксама адкрыць оперны клас. Нягледзячы на часовы ад'езд з горада Г.Львовай і ўскладанне абавязкаў дырэктара курсаў на Ю.Жухавіцкага, 12 сакавіка 1917 г. на курсах адбыўся паказ дзіцячага опернага спектакля, у якім дзеці спявалі, ігралі ролі і танцавалі [1].

Да новай методыкі музычнага выхавання дзяцей праявілі цікавасць у іншых мінскіх гімназіях, менавіта гімназіях Е.Рэйман, Марыінскай жаночай і мужчынскай. Тут выкарыстоўвалі апрабіраваныя на курсах Г.Львовай метады работы, у тым ліку і згаданыя “музычныя практыкаванні”.

У Мінску было шмат прыватных настаўнікаў музыкі, якія вучылі ігры на фартэпіяна, аргане і віяланчэлі (Г.фон Кімель); ігры на фартэпіяна і тэорыі музыкі (Я.Маркузэ); на фартэпіяна і медных інструментах (Клонберг). Педагагічнай дзейнасцю займаліся вядомыя ў горадзе музыканты – скрыпач Г.Мазалёў, піяністы Б.Бімберг, А.Буткевіч, Б.Меер, І.Дабржэвіч, С.Хаванская, Л.Стэфановіч, вакалісты Я.Альшэўскі, Ю.Лео, В.Сабо, П.Маўшовіч, Н.Карафа, Ю.Багуслаўскі і інш.

Узрастаючы попыт гараджан у атрыманні музычных ведаў і набыцці выканальніцкіх навыкаў задавальнялі прыватныя музычныя школы. Зразумела, што ўзровень спецыяльнай падрыхтоўкі ў лепшых з такіх устаноў быў больш высокім, чым у семінарыях, гімназіях, на курсах пры таварыствах.

Музычная школа С.Шацкінай адкрылася ў 1894 г. Яна мела тры спецыяльныя класы – фартэпіяна, спеваў (сольных і харавых) і скрыпкі. У 1902 г. быў адкрыты клас віяланчэлі (М.Пестрыкаў). У якасці абавязковых прадметаў вывучаліся тэорыя музыкі і пачатковыя элементы сальфеджыо. У пачатку XX ст. школа С.Шацкінай была лепшай музычнай навучальнай установай у Мінску. Таму, верагодна, менавіта яна мелася на ўвазе аўтарам артыкула ў “Русской музыкальной газете” за 20 красавіка 1903 г., дзе згадваецца Мінскае музычнае вучылішча. Школа С.Шацкінай працавала амаль 13 гадоў – да лета 1908 г. [2].

У 1906 г. у Мінску адкрылася музычная школа Е.Бохан, у 1908 г. – школа фартэпіяннай ігры А.Клімовіч, якой яна пазней (да сярэдзіны 1917 г.) кіравала сумесна з Г.Іваноўскім.

У Мінску шырокай была сетка надомных школ мінскіх музыкантаў. Напрыклад, урокі “па ўсіх духавых інструментах на даму” даваў капельмайстар 120-га пяхотнага Серпухаўскага палка Р.Морых; па скрыпцы, сальфеджыо, балалайцы і мандаліне – капельмайстар залы “Акварыум” на Юр’еўскай вуліцы М.Барысаў. А.Шаргародскі вучыў ігры на раялі, скрыпцы, духавых драўляных і медных інструментах, выкладаў тэорыю музыкі, гармонію, кантрапункт, кіраваў аматарскім аркестрам. Прыватныя ўрокі музыкі давалі і педагогі школы С.Шацкінай: піяністы С.Хаванская і Р.Масткова, вакалісты Н.Карафа, У.Лемінская, Я.Альшэўскі.

Мінскае музычнае вучылішча – галоўны цэнтр прафесійнай музычнай адукацыі – адкрылася ў 1907 г. Яго гісторыя цесна звязана з дзейнасцю выпускніка Пецярбургскай кансерваторыі, скрыпача, дырыжора і педагога Натана Рубінштэйна. У 1903 г. ён з гастролямі наведаў Мінск у якасці скрыпача-саліста, а ў 1906 г. пераехаў сюды і актыўна ўключыўся ў музычна-грамадскую і канцэртна-выканальніцкую дзейнасць. Гарадскія ўлады падтрымалі яго ініцыятыву аб адкрыцці музычнага вучылішча з “павышанай праграмай” выкладання па класах фартэпіяна, скрыпкі, віяланчэлі, духавых і ўключэннем комплексу тэарэтычных дысцыплін – тэорыі музыкі, сальфеджыо, гармоніі, інструментоўкі, гісторыі музыкі, класа ансамбля. У кастрычніку 1907 г. прайшлі ўступныя экзамены і пачаліся заняткі.

Летам 1908 г. закрылася школа С.Шацкінай, і вучылішча Н.Рубінштэйна засталося адзінай у горадзе навучальнай установай, якая забяспечвала найбольш высокі, у параўнанні з іншымі музычнымі школамі і курсамі, узровень адукацыі. З 1909 г. тут распачаліся рэпетыцыі сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам Н.Рубінштэйна. У 1910 г. былі адкрыты клас спеваў Я.Марачнік-Глайхенхаўс, клас віяланчэлі Л.Зіберштэйн, класы фартэпіяна І.Гянко і Г.Бах. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1911/12 навучальным годзе з мэтай падрыхтоўкі выканаўцаў для сімфанічных аркестраў быў адкрыты клас духавых інструментаў І.Ягудкіна.

З 1912 г. выкладчыкі і навучэнцы вучылішча на чале са сваім дырэктарам Н.Рубінштэйнам актыўна ўключыліся ў культурна-асветніцкую дзейнасць Таварыства сяброў музыкі. На працягу навучальнага года выкладчыкі і навучэнцы арганізоўвалі 5–6 камерных і сімфанічных канцэртаў, якія складаліся з твораў тагачасных кампазітараў і класікаў. Канцэрты суправаджаліся лекцыямі аб музычнай культуры розных краін, жыцці і творчасці асобных кампазітараў, паведамленнем звестак аб выконваемых творах. З 1913 г. у вучылішчы адкрыліся чытальня і бібліятэка Таварыства сяброў музыкі.

Нягледзячы на ваенныя дзеянні, у верасні 1915 г. заняткі ў вучылішчы зноў пачаліся. Многія канцэрты з удзелам навучэнцаў праходзілі ў шпіталях і лазарэтах, у Земскай і Яўрэйскай бальніцах, у дзіцячых прытулках. Але з набліжэннем да Мінска ваенных дзеянняў вучылішча пакінулі многія педагогі. У Мінску засталіся Г.Бах, Ю.Багуслаўскі, Р.Маўшовіч, якія займаліся прыватнай педагагічнай практыкай. У 1916 г. заняткі ў вучылішчы перапыніліся, і яно зачынілася.

У 1916 г. фронт наблізіўся да Мінска, і культурнае жыццё ў горадзе пачало заміраць. Летам 1917 г. спыніліся заняткі ў музычнай школе Г.Іваноўскага і на музычных курсах Г.Львовай. Дзейнічалі толькі кінатэатры, аперэтка В.Чэбушавай і фарс «Маскоўскі». На карысць параненых салдат і сірот праводзіліся дабрачынныя мерапрыемствы, у тым ліку і канцэрты, у якіх бясплатна ўдзельнічалі прафесійныя і самадзейныя артысты, навучэнцы музычных навучальных устаноў разам са сваімі настаўнікамі. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. аднавіла сваю дзейнасць Першае таварыства беларускай драмы і камедыі І.Буйніцкага, быў створаны беларускі хор пад кіраўніцтвам У.Фальскага і А.Смоліча. Дзейнічаў клуб беларускай творчай інтэлігенцыі "Беларуская хатка", выступалі народны хор У.Тэраўскага, танцавальны ансамбль Ч.Радзевіча, народны аркестр Дз.Захара.

Нават ва ўмовах нямецкай акупацыі Мінска, якая доўжылася з лютага па снежань 1918 г., рабіліся спробы стварэння новых для Беларусі музычных навучальных устаноў: 22 красавіка адкрылася Вышэйшая музычная школа, а 1 чэрвеня – кансерваторыя. На жаль, далейшае развіццё ваенна-палітычнай сітуацыі на беларускіх землях не спрыяла дзейнасці названых устаноў і развіццю музычнай адукацыі ўвогуле. Пасля адступлення нямецкіх войскаў 1 студзеня 1919 г. была абвешчана Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, але ўжо ў жніўні гэтага ж года Мінск акупіравалі белапалякі, якія заставаліся тут да ліпеня 1920 г.

Кастрычніцкая рэвалюцыя нарадзіла новыя погляды на ролю і месца музычнага мастацтва ў сацыялістычным грамадстве, на арганізацыю сістэм музычна-эстэтычнага выхавання насельніцтва і прафесійнай музычнай адукацыі: актыўна развіваецца мастацкая самадзейнасць, пашыраецца канцэртна-асветніцкая дзейнасць музыкантаў-прафесіяналаў і аматараў, урокі музыкі ўводзяцца ў якасці абавязковага прадмета ў агульнаадукацыйныя школы, ствараюцца новыя ўстановы прафесійнай музычнай адукацыі.

У савецкі час адным з першых арганізатараў клубнай аркестравай сама- дзейнасці стаў І.Ягудкін.Традыцыі харавога выканаўства пачалі адраджацца намаганнямі Ф.Леўчанкі, Ф.Серыкава, В.Чарнякоўскага, І.Краснапеўцава і іншых мінскіх музыкантаў. У.Тэраўскі ў 1918–1919 гг. кіраваў харавой капэлай у Беларускім савецкім тэатры, працаваў галоўным хормайстрам Беларускага дзяржаўнага тэатра ў Мінску (БДТ-1), у 1920-я гг. узначальваў харавыя калектывы, створаныя пры БДУ, Мінскім педагагічным тэхнікуме, Прафесійным саюзе паштавікоў-тэлеграфістаў. М.Равенскі з 1919 г. кіраваў хорам пры Беларускім рабочым клубе, працаваў хормайстрам гарадскога тэатра. Утрымальніца прыватнай музычнай школы Р.Маўшовіч актыўна ўдзельнічала ў канцэртным жыцці беларускай сталіцы: у 1921 г. яна стала педагогам гарадской музычнай школы, з 1924 г. выкладала фартэпіяна ў Мінскім музычным тэхнікуме. В.Абрамовіч, выкладчыца спеваў у музычным вучылішчы Н.Рубінштэйна, з 1921 г. выкладала ў Першай музычнай школе ў Мінску.

Пачаткам стварэння прафесійнай музычнай адукацыі ў савецкім Мінску стала адкрыццё ў 1919 г. народнай кансерваторыі – музычна-асветніцкай установы, якая шырока выкарыстоўвала назапашаны Маскоўскай народнай кансерваторыяй (адкрыта ў 1906 г.) багаты вопыт музычнага выхавання малазабяспечаных слаёў насельніцтва. У адпаведнасці з "Асноўнымі палажэннямі аб Дзяржаўным музычным універсітэце" (1919) гэтая ўстанова была рэарганізавана ў 1921 г. у музычную школу 1-й і 2-й ступеней з чатырох- і трохгадовым тэрмінамі навучання, а ў 1926 г. – у школу-сямігодку сучаснага тыпу. Першая сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сістэмы музычнай адукацыі – Мінскі музычны тэхнікум – адкрылася ў 1922 г. Стварэнне трохступеньчатай сістэмы прафесійнай музычнай адукацыі ў Беларусі заканчваецца толькі ў 1932 г. з адкрыццём Беларускай кансерваторыі.

Такім чынам, складаная ваенна-палітычная сітуацыя ў краіне і рэвалюцыйныя пераўтварэнні не змаглі перапыніць паступальнага развіцця сістэмы музычнай адукацыі ў Мінску. Але з усталяваннем савецкай ўлады гэты працэс набыў мэтанакіраваны і арганізаваны характар. На дзяржаўным узроўні былі рэалізаваны прынцыпы ўсеагульнасці музычнага выхавання і даступнасці музычнай адукацыі, пачалося будаўніцтва трохступеньчатай сістэмы прафесійнай музычнай адукацыі.


1.*Пракапцова В.П.* Мастацкая адукацыя ў Беларусі. – Мн.: Бел. ун-т культуры, 1999. – С. 127–128.

2. *Масленікава В.П.* Музычная адукацыя ў Беларусі. – Мн.: Навука і тэхніка, 1980. – С. 26–27.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ